Больш позні гісторыка-стылёвы пласт беларускай песеннай творчасці звязаны з развіццём падгалосачнага шматгалосся.

Вышэйшым тыпам (ці т.зв. "канцэртным" відам) народнага поліфанічнага шматгалосся З.Мажэйка лічыць палескую харавую традыцыю спявання з "падводкай", у якой спяваюць у асноўным лірычныя песні. Харавая аснова такіх песень складаецца з дзвюх абавязковых партый, прычым кожная з іх мае сваю спецыфіку. Асноўны напеў заўсёды гучыць у ніжнім голасе, выконваючы ролю cantus firmus, а верхні (падводка), вар`іруючы напеў, накладаецца на яго на інтэрвал квінты. Гэтым гранічным функцыянальным раздзяленнем галасоў, паводле вызначэння З.Мажэйкі, і адрозніваецца беларуская палеская песня ад падобных украінскіх і тым больш рускіх, дзе ўзаемадзеянні двух аналагічных галасоў даюць змяненні абодвух. У параўнанні з украінскім гарманічным беларускі палескі шматгалосы склад характарызуецца як больш поліфанічны.

У кнізе "Песенная культура Беларускага Палесся" З.Мажэйка апісвае таксама віды і тыпы "падводкі".

Адлюстроўваючы багатую і разнастайную музычную спадчыну народа, безупынна развіваючыся, беларускае народнае шматгалоссе служыць базавым музычным матэрыялам у творчасці сучасных кампазітараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мазанік В.У.,**
*суіскальнік кафедры*
*беларускай і сусветнай*
*мастацкай культуры*

## РАЗВІЦЦЁ ДЫРЫЖОРСКАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ

Працэс фарміравання дырыжорска-выканальніцкага мастацтва на Беларусі праходзіў у двух напрамках. З аднаго

боку, з адкрыццём музычнага тэхнікума і дзяржаўнай кансерваторыі пачалася падрыхтоўка айчынных высокакваліфікаваных музыкантаў-выканаўцаў, аркестравых музыкантаў, дырыжораў; з другога — прыток расійскіх музыкантаў, выкладчыкаў, укараненне ў структуру сістэмы адукацыі вопыту Пецярбургскай і Маскоўскай кансерваторый садзейнічалі засваенню ўсяго лепшага, што набыта было дзесяцігоддзямі.

У тым выглядзе, у якім дырыжыраванне існуе ў цяперашні час,— гэта адна з найбольш маладых музычна-выканальніцкіх спецыяльнасцей. Дырыжорскае мастацтва ў яго сучасным значэнні пачало складвацца ў першай палове XIX стагоддзя, а прафесійная дырыжорская адукацыя зараджаецца ў канцы гэтага стагоддзя. У Расіі да 30-х гадоў бягучага стагоддзя пытанне падрыхтоўкі дырыжораў было прынцыпова вырашана: вызначыліся формы і тэрміны навучання, былі зацверджаны вучэбныя планы і праграмы, намечана методыка навучання. На Беларусі станаўленне дырыжорскай адукацыі можна аднесці да другой паловы 30-х гадоў. Аб гэтым сведчаць факты, прыведзеныя ў адпаведнай літаратуры, у даследаваннях беларускіх мастацтвазнаўцаў.

Беларускія даследчыкі звярталіся да розных бакоў музычнага жыцця нашай краіны. У працах Б.Смольскага, Г.Барышава, А.Капілава, В.Дадзіёмавай, А.Ахвердавай, В.Масленікавай, А.Карацеева асвятляліся праблемы тэатра, скрыпічнага, фартэпіяннага, духавога мастацтва, музычнай адукацыі на Беларусі. Вывучэнне і асэнсаванне праблем айчыннага аркестравага дырыжорскага мастацтва з'яўляецца актуальным, таму што гэта "чыстая старонка" ў музычнай культуры рэспублікі. Цікавасць да развіцця дырыжорскага аркестравага мастацтва як аднаго з відаў музычна-выканальніцкага мастацтва, да пытанняў, звязаных з выхаваннем дырыжораў на Беларусі, абумоўлена актыўным распаўсюджваннем аркестравай музыкі, дзейнасцю існуючых аркестраў (у тым ліку арганізаваных зусім нядаўна).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На Беларусі здаўна складаліся спрыяльныя ўмовы для развіцця прафесійнага аркестравага выканання. Першапачатковая музычная калектыўная дзейнасць мела глыбокія карані і стала трывалым падмуркам для ўзнікнення розных інструментальных капэл і аркестраў.

На XVIII стагоддзе прыпадае росквіт ансамблевага і аркестравага выканання. У гэты ж час вылучаюцца кіраўнікі калектываў, гэта былі першыя капельмайстры на Беларусі. Вось іх імёны: Ян Цэнцыловіч і Ежы Бакановіч (Нясвіж), Міхаіл Бяляўскі (Слонім), Аляксандр Зорка (Шклоў), Ляон Сітаньскі (Гродна). Дзейнасць першых капэл, аркестраў, лепшых капельмайстраў аказала ўплыў на прафесійнае дырыжорска-выканальніцкае мастацтва. У гэты час як у Расіі, так і ў Заходняй Еўропе не было рэзкага дзялення на музычныя спецыяльнасці, і музыканты сумяшчалі выканальніцкую, педагагічную дзейнасць, а самыя таленавітыя выступалі ў ролі капельмайстраў.

XIX стагоддзе — гэта новая ступень развіцця аркестравага выканання і музычнай культуры наогул, у гэты час музычны прафесіяналізм набывае якасна новы ўзровень. Узнікаюць першыя музычныя гурткі і таварыствы, адкрываюцца музычныя школы, актывізуецца канцэртная дзейнасць у буйных гарадах Беларусі.

У пачатку XX стагоддзя на Беларусі ствараюцца народныя кансерваторыі, якія рэарганізуюцца ў музычныя школы і тэхнікумы. Так, Віцебск стаў цэнтрам музычнага жыцця на тэрыторыі Беларусі, першым сапраўдным ачагом культуры, які садзейнічаў распаўсюджванню і шырокай прапагандзе музычнага мастацтва. Першы ў Беларусі сімфанічны аркестр, заснавальнікам і кіраўніком якога быў М.Малько, за два з паловай гады даў 246 канцэртаў. Вучань М.Рымскага-Корсакава (кампазіцыя), М.Чарапніна (дырыжыраванне), М.Лаўрова (фартэпіяна), дырыжор Марыінскага тэатра ў Пецярбургу М.Малько з 1918 г. па 1921 г. працуе дырэктарам народнай кансер-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваторыі і галоўным дырыжорам гарадскога сімфанічнага аркестра.

У хуткім часе з'яўляюцца народныя кансерваторыі ў Гомелі і Мінску (1919), у Бабруйску (1921). Разам з падрыхтоўкай прафесійных музыкантаў яны вядуць вялікую асветніцкую работу.

Аднак зараджэннем прафесійнай музычнай адукацыі на Беларусі афіцыйна прынята лічыць адкрыццё ў 1924 годзе Мінскага музычнага тэхнікума, які стаў своеасаблівым цэнтрам музычнага жыцця рэспублікі. У 30-я гады ў сувязі з вострай праблемай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў была створана першая ў рэспубліцы вышэйшая музычная ўстанова — кансерваторыя.

Узнікненне прафесійнай дырыжорскай адукацыі на Беларусі звязваецца з адкрыццём у 1937 годзе ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі дырыжорскага класа пад кіраўніцтвам І.Мусіна. Гэта першы этап развіцця дырыжорскай адукацыі, на якім былі закладзены асновы падрыхтоўкі дырыжорскіх кадраў на Беларусі. Упершыню дырыжыраванне выкладалася як асобная дысцыпліна. У 1937/38 навучальным годзе І.Мусін узначальваў клас оперна-сімфанічнага дырыжыравання.

У 1938 годзе ў кансерваторыі адкрываецца клас народных інструментаў, і студэнты пачынаюць вывучаць асновы дырыжыравання аркестрам. З 1940 года на аддзяленні народных інструментаў тэхніку дырыжыравання выкладае С.Ратнер. У пасляваенны перыяд (1949 г.) арганізоўваецца кафедра народных інструментаў, і С.Ратнеру перадаецца клас спецыяльнага дырыжыравання аркестрам народных інструментаў. Акрамя таго, у розныя гады ён з'яўляўся кіраўніком аркестравай групы Дзяржаўнага народнага хору, дырыжорам Дзяржаўнага народнага аркестра рэспублікі. За час працы ў кансерваторыі С.Ратнера падрыхтавана больш 50 дырыжораў аркестра народных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 50-я гады павялічваецца колькасць студэнтаў. Запрашаюцца дырыжоры ДАВТа Беларусі, Дзяржаўнага аркестра беларускіх народных інструментаў. У розныя гады на кафедры працавалі заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь І.Гітгарц, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь М.Шнейдэрман, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь У.Дуброўскі, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь І.Абраміс, якія выхавалі новае пакаленне высокапрафесійных дырыжораў, таленавітых выкладчыкаў.

Другі этап развіцця дырыжорскай адукацыі на Беларусі на новым узроўні пачынаецца з адкрыццём у 1966 годзе, пасля доўгага перапынку, у кансерваторыі класа оперна-сімфанічнага дырыжыравання. А праз некаторы час ствараецца кафедра оперна-сімфанічнага дырыжыравання. Арганізацыя кафедры была даручана заслужанаму артысту Рэспублікі Беларусь, галоўнаму дырыжору Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь В.Катаеву. Выхаванец Маскоўскай і Ленінградскай кансерваторый па класе Я.Рацэра і Н.Рабіновіча, В.Катаеў прыйшоў у Белдзяржкансерваторыю ўжо вопытным музыкантам. За гады работы ён выхаваў шмат студэнтаў, якія сталі выкладчыкамі, прафесійнымі дырыжорамі.

З развіццём аддзяленняў духавых інструментаў у музычных вучылішчах, стварэннем самадзейных духавых аркестраў і аркестраў у навучальных установах узнікла неабходнасць падрыхтоўкі дырыжораў духавога аркестра. Каб вырашыць гэтую задачу, у сярэдзіне 60-х гадоў у кансерваторыю запрашаюцца ваенныя дырыжоры, заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь А.Майзлер, У.Мартынаў, народны артыст Рэспублікі Беларусь Б.Пянчук. У сувязі з тым, што раней студэнты аддзялення духавых інструментаў дырыжыраванне не вывучалі, за аснову былі прыняты планы і вучэбныя праграмы па дырыжыраванні, чытанні партытур, інструментоўцы для аддзялення народных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пазней кафедра папоўнілася маладымі выкладчыкамі, якія атрымалі адукацыю ў Беларусі. Гэта Э.Арашкевіч, А.Берын, С.Кафанаў, З.Шаціла. У 70—80-я гады на кафедру прыйшлі працаваць выпускнікі аддзялення народных інструментаў Г.Ермачэнкаў, П.Вандзілоўскі, А.Лысенка. Курсы інструментоўкі, чытання партытур выкладаюць вядомыя кампазітары рэспублікі.

Творчую і педагагічную дзейнасць сумяшчае рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, народны артыст Рэспублікі Беларусь, галоўны дырыжор Дзяржаўнага народнага аркестра імя І.Жыновіча М.Казінец.

З мэтай паляпшэння практычнай падрыхтоўкі студэнтаў у акадэміі музыкі існуе аркестр дырыжорскай практыкі, дзе дырыжоры маюць магчымасць рыхтаваць свае ўласныя інструментоўкі. Гэтай дзейнасці ў вучэбнай праграме адводзіцца дастаткова часу, таму што менавіта складаная структура аркестравых рэпетыцый, абумоўленых спецыфікай заняткаў, стварае цудоўныя ўмовы для розных бакоў прафесійнай падрыхтоўкі і фарміравання асобы дырыжора.

З 1974 года ў Белдзяржкансерваторыі існуе асістэнтура-стажыроўка, дзе павышаюць кваліфікацыю кіраўнікі і дырыжоры аркестравых калектываў, выкладчыкі музычных вучылішчаў, вучылішчаў мастацтваў, вышэйшых навучальных устаноў. Такім чынам, складалася сістэма паслядоўнасці ў навучанні (ВНУ-аспірантура-стажыроўка).

Увесь час кафедру аркестравага дырыжыравання ўзначальвалі вядомыя і таленавітыя дырыжоры і педагогі: з 1968 г. па 1975 г.— І.Букрэеў, з 1975 г. па 1985 г.— С.Кафанаў, з 1985 г. па 1997 г.— А.Берын, зусім нядаўна на пасадзе загадчыка кафедры працуе выхаванец кансерваторыі, дырыжор Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра П.Вандзілоўскі.

Беларускі універсітэт культуры (раней інстытут культуры) з першага дня існавання рыхтуе кіраўнікоў аркестра народных інструментаў, аркестра духавых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструментаў, пазней — эстраднага аркестра. Выпускнікі кафедраў народна-інструментальнай творчасці, духавой музыкі, эстраднага мастацтва, факультэта мастацкай творчасці працуюць кіраўнікамі аркестраў і ансамбляў у музычных школах, самадзейнасці, прафесійных калектывах не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі.

Ва універсітэце працэс навучання ажыццяўляецца на аснове ўсебаковага ўліку патрабаванняў сучаснасці. Асоба кіраўніка (дырыжора) аркестра выхоўваецца ў выніку засваення цэлага комплексу спецыяльных дысцыплін. Гэты блок дысцыплін фарміруе ў будучага кіраўніка аркестравага калектыву веды, навыкі і здольнасці, неабходныя для будучай спецыяльнасці. Навучанне тут ажыццяўляецца ў форме індывідуальных, групавых, калектыўных заняткаў. Такая разнастайнасць дазваляе зрабіць навучанне больш эфектыўным.

Вядзецца вялікая метадычная і навукова-даследчая работа. Падрыхтавана шмат новых праграм, метадычных распрацовак, якія дапамагаюць рыхтаваць спецыялістаў на высокім прафесійным узроўні.

Такім чынам, на Беларусі склалася стройная сістэма падрыхтоўкі дырыжорскіх кадраў, кіраўнікоў аркестравых калектываў, што ў сваю чаргу ўплывае на развіццё дырыжорска-выканальніцкага мастацтва. Акадэмія музыкі і універсітэт культуры паспяхова вырашаюць задачу фарміравання высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ